# ЭЎРЫКА! АДКРЫВАЕМ ПРАВІЛА. МЕТОДЫКА ЗАВУЧВАННЯ АРФАГРАФІЧНЫХ ПРАВІЛАЎ І АЗНАЧЭННЯЎ ГРАМАТЫЧНЫХ ПАНЯЦЦЯЎ

*М._І._Сянкевіч*

На працягу навучання ў пачатковых класах малодшы школьнік сустракаецца з дастаткова вялікаю колькасцю арфаграфічных правіл, яму даводзіцца запамінаць мноства граматычных паняццяў.

Кожны настаўнік, рыхтуючыся да ўрока, на якім будзе вывучацца правіла, павінен прытрымлівацца наступнай паслядоўнасці ў сваіх дзеяннях:

1. Прааналізаваць правіла, падзяліць яго на састаўныя часткі, прадумаць наглядны запіс на дошцы, на табліцы, каб ён дапамог настаўніку паслядоўна растлумачыць правіла, а вучням – зразумець яго сутнасць
2. Распрацаваць сістэму пытанняў і заданняў, каб яны забяспечылі актыўнасць дзяцей пры фармулёўцы правіла.
3. Калі гэта магчыма, прадумаць кароткую фармулёўку правіла, зручную для пажыццёвай практыкі пісьма.
4. Падабраць патрэбны матэрыял для замацавання.
5. Прадумаць, як навучыць дзяцей прыёму самаправеркі.
6. Прааналізаваць сістэму практыкаванняў у падручніку і дапоўніць яе вопытам сваёй працы.

Мы падрабязней спынімся на тым этапе ўрока, калі правіла двойчы “выведзена” шляхам абагульнення моўнага матэрыялу. Непасрэдна пасля гэтага яно павінна быць прачытана і завучана па падручніку. Для гэтых мэт адводзіцца некалькі хвілін урока.

Трэба памятаць, што сама фармулёўка правіла – гэта невялікі фрагмент тэксту, які ўмоўна можна аднесці да навуковага стылю, таму ёсць неабходнасць яго ўдумлівага аналізу.

Калі правіла ўяўляе сабой азначэнне пэўнага граматычнага паняцця, то свядомаму яго завучванню дапамогуць два пытанні: адно з іх будзе накіравана на засваенне самога тэрміна, а другое – на засваенне азначэння гэтага тэрміна. Напрыклад, да правіла: “Агульная частка роднасных слоў называецца коранем” – вучні маюць магчымасць паставіць пытанні: “Як называецца агульная частка роднасных слоў?” і “Што называецца коранем?”.

Іншы раз у маладых настаўнікаў, у студэнтаў-практыкантаў можа ўзнікнуць пытанне, ці абавязкова трэба завучваць на памяць правілы і азначэнні граматычных паняццяў. Адказ можа быць толькі станоўчым, але пры умове, што дзеці на аснове аналізу і абагульнення моўнага матэрыялу самі прыйшлі да высновы, якая сфармулявана ў падручніку ў выглядзе правіла. Трэба сказаць, што над тэкстамі такіх высноў працуюць вопытныя метадысты і навукоўцы, асобныя азначэнні не мяняюцца на працягу многіх дзесяцігоддзяў, і вучань пачатковых класаў “сваімі словамі” не зможа перадаць змест правіла больш дакладна, чым гэта зроблена ў падручніку.

Для пераходу завучанага правіла з кароткатэрміновай памяці ў доўгачасовую вялікае значэнне мае шматкратнасць паўтарэнняў, выкарыстанне элементаў займальнасці. У практыцы работы школы, у метадычнай літаратуры [2] назапашаны розныя метадычныя прыёмы завучвання на памяць "выведзенага" правіла. Назавем асобныя з іх.

*1. Гульня "Ваш пропуск, слова!"*

Вядучы па аднаму называе словы, якія ўваходзяць (ці не ўваходзяць) у правіла. Правільным словам дзеці "сігналяць" зялёнымі картачкамі і запісваюць такія словы на лісце паперы. Памылковым словам уваход "забараняецца" чырвонымі картачкамі.

*2. Гульня "Раскажы правіла па аднаму слову"*

Трэба расказаць правіла па аднаму слову па парадку. Гэта паўтараецца некалькі разоў. Пры вымаўленні слова вучань хутка ўстае, а вымавіўшы яго, – сядае. Калі нехта забывае назваць слова, то за яго адказвае наступны вучань. Карысць гэтай гульні ў тым, што, вымаўляючы адно слова, вучань павінен трымаць у памяці ўсё правіла на працягу доўгага часу.

*3. Гульня "Знайдзі ў правіле слова"*

Настаўнік можа даць наступныя заданні:

– знайдзі ў правіле словы, якія маюць адзін склад;

– знайдзі словы, якія складаюцца толькі з кораня;

– знайдзі словы, якія з'яўляюцца прыметнікамі мужчынскага роду і інш.

Выбар заданняў залежыць ад таго, якое правіла настаўнік хоча з вучнямі паўтарыць, да вывучэння якога матэрыялу падрыхтавацца.

*4. Гульня "Навучы правілу папугая"*

Адзін вучань выступае ў ролі настаўніка, а другі іграе папугая. "Настаўнік" вымаўляе першы выраз з правіла і спыняецца, чакае, пакуль "папугай" паўторыць. Калі памылкі няма, "настаўнік" называе наступны сказ з правіла. Пасля дзеці мяняюцца ролямі.

*5. Гульня "Якое слова "праглынуў" дыктар?"*

Настаўнік ці загадзя падрыхтаваны вучань чытае правіла, прапускаючы адно з асноўных слоў. Дзеці павінны гэтае слова назваць.

*6. Расказванне правіла ў розных варыянтах і ролях:*

– раскажы правіла так, як расказаў бы яго першакласніку;

– раскажы так, нібы ты сам зрабіў адкрыццё правіла *("Эўрыка! Ура! Пасля зычных, якія не маюць парных па мяккасці, пішуцца галосныя а, о, у, э, ы);*

– перадай правіла "па радыё", як самую важную навіну *(Увага! Перадаём апошняе паведамленне. Вучням другога класа сярэдняй школы № 15 горада Брэста стала вядома, што не з дзеясловамі пішацца асобна);*

– уяві сітуацыю, што вялікі паветраны шар нясе цябе ў цудоўнае падарожжа, падымае ўсё вышэй. На развітанне ты павінен расказаць правіла тым, хто застаецца на зямлі;

– раскажы правіла так, каб ніхто за дзвярыма не падслухаў…

Запамінанню многіх правіл граматыкі і арфаграфіі дапамагаюць мнеманічныя прыёмы. *Мнемоніка* (*гр. mnemonika* – майстэрства запамінання) – сукупнасць правіл і прыёмаў, якія маюць на мэце аблягчыць запамінанне як мага большай колькасці звестак і фактаў [1, с. 90]. Са школьных гадоў кожны з нас памятае фразу, якая выкарыстоўвалася на ўроках фізікі для запамінання колераў вясёлкі – “Каждый охотник желает знать, где сидит фазан». Дарэчы, адносна нядаўна газета “Наша Ніва” аб’явіла конкурс на лепшы мнеманічны прыём, які б дазволіў запомніць колеры вясёлкі па-беларуску. Перамога была за сказам: “Чароўная Панна Жаніхоў Зазывала, Броўкі Сабе Фарбавала”.

Падобныя прыёмы можна выкарыстоўваць і пры вывучэнні граматыкі і арфаграфіі. Асобныя з іх прапануем ніжэй.

Пры запамінанні двайнога значэння ётавых галосных *е, ё, і, ю, я* карыснай будзе фраза: *“Ульяна, з’еш мае яблыкі”.*

Пры вывучэнні зычных гукаў карысна запомніць, што ў алфавіце ўсе зычныя да *[п],* акрамя *[к], –* звонкія.

У сказе: *“Мы ж не забывалі адзін аднаго” –* усе зычныя звонкія.

У сказе: *“Раман ліў вар” –* усе гукі санорныя. Можна скласці і іншыя сказы падобнай канструкцыі, напрыклад: *“Раман еў варэнне на лаве”, “Вельмі рана ў рай”, “Вымаўлена мілай Венерай”.*

Пры вывучэнні правіл напісання раздзяляльнага мяккага знака і апострафа дапаможа словазлучэнне “*зялёныя суніцы*” – пасля зычных, якія ўтрымліваюцца ў гэтым спалучэнні слоў, пішацца раздзяляльны мяккі знак.

Пры вывучэнні націску можна выкарыстоўваць прыём *“не гавары (гавары) так”*, напрыклад: *“Вось якая навін**а**: еду ў госці да слана” або “Крапів**а** – сярдзітая трава”.*

Завучыць азначэнні моўных паняццяў дапаможа і такі мнеманічны прыём, як расшыфроўка правіла, запісанага з дапамогай першых літар кожнага слова, напрыклад: *СВЗД – сказ выражае закончаную думку.*

Застаецца яшчэ раз нагадаць, што і арфаграфічныя правілы і азначэнні граматычных паняццяў завучваюцца пасля таго, як яны “выведзены” на ўроку (не менш за два разы) шляхам абагульнення адпаведнага моўнага матэрыялу.

Літаратура

1. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў: У 2 т. Т. 2: М – Я / А. М. Булыка. – Мінск : БелЭн, 1999. – С. 90.

2. Лайло, В. П. Какое слово директор проглотил: Приёмы лучшего запоминания правил / В. П. Лайло // Учительская газета. – 1997. – № 20